Ogłoszenia parafialne

VI звычайная нядзеля

13 lutego 2021

Аб’явы

на нядзелю 14 /02/ 2021

1. У сераду распачынаем Вялікі Пост. Пасыпанне галавы попелам адбудзецца падчас св. Імшы ў 8.00, 11.00 і 19.00. У гэты дзень абавязковы сціслы пост. (Сціслы пост – устрыманне ад мясных страваў і абмежаванне ў колькасці ежы. Сціслы пост датычыць тых, хто мае 18 гадоў і не мае 60-ці (кан. 1252). У дні сціслага посту можна цалкам падсілкавацца адзін раз, а ўсе іншыя прыёмы ежы абмежаваць. Тыя, хто не дасягнуў 18-гадовага ўзросту, павінны адмаўляцца ад мясных страў). Згодна з касцёльным наказам, у перыяд Вялікага посту неабходна ўстрымлівацца ад удзелу ў забавах.
2. Падчас Вялікага Посту запрашаю на набажэнства крыжовы шлях. У пятніцу ў 18.30 (падрыхтоўвае супольнасць “Апостальства дапамогі душам Чысцовым”) і ў нядзелю крыжовы шлях ў 10.30.
3. Песні Жальбы будуць спявацца ў кожную нядзелю Вялікага Посту перад св. Імшой ў 14:30.
4. У наступную надзелю ў 14.00 малітва супольнасці „Маці ў малітве”.
5. Дзякую за складзеныя ахвяры на патрэбы касцёла.